*УДК 394.2*

# АХОВА НЕМАТЭРЫЯЛЬНАЙ КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ: КАНВЕНЦЫЯНАЛЬНЫЯ І ПРАКТЫЧНЫЯ АСПЕКТЫ

***А. Б. СТАШКЕВІЧ***[1*]

[1*]*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь*

Абмяркоўваюцца заканадаўчыя і практычныя аспекты аховы нематэрыяльнай культурнай спадчыны (НКС) з пункту гледжання міжнародных і нацыянальных падыходаў. Даследуецца беларускі вопыт імплементацыі Канвенцыі ЮНЕСКА аб ахове нематэрыяльнай культурнай спадчыны 2003 г., рызыкі і праблемы, якія яго суправаджаюць, а таксама спосабы іх мінімізацыі. Асаблівая ўвага надаецца ідэнтыфікацыі і інвентарызацыі НКС у Беларусі і іншых краінах, падкрэсліваецца іх значэнне для кіравання спадчынай, разглядаецца фактар удзелу носьбітаў нематэрыяльнай культурнай спадчыны, найперш супольнасцей, груп і асобных людзей, для якіх НКС з'яўляецца паказчыкам іх ідэнтычнасці.

***Ключавыя словы:*** Канвенцыя ЮНЕСКА 2003 г.; нематэрыяльная культурная спадчына; ахова нематэрыяльнай культурнай спадчыны; практыка аховы нематэрыяльнай культурнай спадчыны; супольнасці і групы, датычныя да нематэрыяльнай культурнай спадчыны; носьбіты і практыкі нематэрыяльнай культурнай спадчыны.

# ОХРАНА НЕМАТЕРИАЛЬНОГО КУЛЬТУРНОГО НАСЛЕДИЯ: КОНВЕНЦИОНАЛЬНЫЕ И ПРАКТИЧЕСКИЕ АСПЕКТЫ

***А. Б. СТАШКЕВИЧ***[1)]

[1)]*Белорусский государственный университет, пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, Беларусь*

Обсуждаются законодательные и практические аспекты охраны нематериального культурного наследия (НКН) с точки зрения международных и национальных подходов. Исследуется белорусский опыт имплементации Конвенции ЮНЕСКО об охране нематериального культурного наследия 2003 г., риски и проблемы, связанные с этим

**Образец цитирования:**
Сташкевіч АБ. Ахова нематэрыяльнай культурнай спадчыны: канвенцыянальныя і практычныя аспекты. *Человек в социокультурном измерении.* 2022;2:55–62.

**For citation:**
Stashkevich AB. Safeguarding of the intangible cultural heritage: conventional and practical aspects. *Human in the Socio-Cultural Dimension.* 2022;2:55–62. Belarusian.

**Автор:**
***Алла Борисовна Сташкевич*** – старший преподаватель кафедры культурологии факультета социокультурных коммуникаций.

**Author:**
***Alla B. Stashkevich***, senior lecturer at the department of cultural studies, faculty of socio-cultural communications.
*as.belicom@gmail.com*

CC BY NC

процессом, а также пути их минимизации. Особое внимание уделяется идентификации и инвентаризации элементов НКН в Беларуси и других странах, подчеркивается их значение для управления наследием, а также рассматривается фактор участия носителей НКН, в первую очередь сообществ, групп и отдельных лиц, для которых данное наследие является фактором их идентичности.

***Ключевые слова:*** Конвенция ЮНЕСКО 2003 г.; нематериальное культурное наследие; защита нематериального культурного наследия; практика защиты нематериального культурного наследия; сообщества и группы, относящиеся к нематериальному культурному наследию; носители и практики нематериального культурного наследия.

# SAFEGUARDING OF THE INTANGIBLE CULTURAL HERITAGE: CONVENTIONAL AND PRACTICAL ASPECTS

***A. B. STASHKEVICH*** [a]

[a]*Belarusian State University, 4 Niezaliežnasci Avenue, Minsk 220030, Belarus*

This article examines the legislative and practical aspects of the intangible cultural heritage (ICH) safeguarding against the point of view of international and national approaches. The Belarusian experience in the implementation of the 2003 UNESCO Convention for the Safeguarding of the Intangible Cultural Heritage, the risks, and threats that accompany, and ways for minimising them are studied. Special attention is paid to the study of the process of identification and inventorying of ICH in Belarus and other countries. Its importance for heritage management is emphasised. The factor of participation of the bearers of ICH is considered, foremost, for the communities, groups, and individuals involved in it, for whom the cultural heritage is an indicator of their identity.

***Keywords:*** 2003 UNESCO Convention; intangible cultural heritage; safeguarding of intangible cultural heritage; intangible cultural heritage safeguarding practices; communities; groups associated with intangible cultural heritage; intangible cultural heritage bearers and practitioners.

## Уводзіны

Канвенцыя аб ахове нематэрыяльнай культурнай спадчыны, якая была прынята ЮНЕСКА 17 кастрычніка 2003 г. (далей – Канвенцыя 2003 г.), паступова набывае ўсё больш прыхільнікаў сярод краін свету і далучае да сферы свайго ўплыву шырокае кола стэйкхолдараў і актараў – ад дзяржаўных органаў улады, разнастайных арганізацый і ўстаноў да прадстаўнікоў няўрадавага сектара. Сёння Канвенцыю 2003 г. ратыфікавала больш за 180 дзяржаў-удзельніц. У Рэспубліцы Беларусь дадзены міжнародны дагавор быў падпісаны 5 лютага 2005 г. (у ліку першых 26 краін). Гэта паказвае, што Беларусь цалкам падзяляе ўсе яго прынцыпы і палажэнні.

У Канвенцыі 2003 г. даецца азначэнне нематэрыяльнай культурнай спадчыны (НКС). НКС ахоплівае сацыяльныя практыкі, звычаі, уяўленні, формы выказвання, веды і навыкі, а таксама звязаныя з імі інструменты, аб'екты, артэфакты і культурныя прасторы, якія датычацца іх супольнасці. Групы і асобныя людзі ідэнтыфікуюцца як неад'емная частка сваёй культурнай спадчыны. НКС перадаецца з пакалення ў пакаленне, пастаянна аднаўляецца супольнасцямі і групамі ў залежнасці ад гісторыі акаляючага асяроддзя, іх узаемадзеяння з прыродай; фарміруе ў іх пачуцце самабытнасці і пераемнасці, тым самым садзейнічае павазе да культурнай разнастайнасці і творчасці чалавека[1] (арт. 2.1 Канвенцыі 2003 г.).

Далей падкрэсліваецца, што для мэт Канвенцыі 2003 г. разглядаецца выключна «такая нематэрыяльная культурная спадчына, якая сумяшчаецца з існуючымі міжнароднымі нормамі па правах чалавека, патрабаваннямі ўзаемнай павагі паміж супольнасцямі, групамі і асобнымі людзьмі, а таксама ўстойлівага развіцця»[2]. Сама Канвенцыя 2003 г., як міжнародны заканадаўчы акт, і яе імплементацыя на нацыянальным узроўні накіраваны на прадухіленне сацыяльных канфліктаў, развіццё ўзаемапавагі як унутры супольнасцей НКС, так і паміж прадстаўнікамі больш шырокага грамадства. У Канвенцыі 2003 г. не падтрымліваюцца ніякія іерархіі ў прасторы культуры, не прымаецца ўсялякае дзяленне культуры на нізавую і высокую, абапіраючыся на асноўную парадыгму Усеагульнай дэкларацыі ЮНЕСКА аб культурнай разнастайнасці, у якой сцвярджаецца, што «культура павінна разглядацца як сукупнасць уласцівых

[1]Основные тексты Международной конвенции об охране нематериального культурного наследия 2003 г. Париж : ЮНЕСКО, 2018. 168 с.

[2]Там же. С. 5 (тут і далей пераклад наш. – *А. С.*).

грамадству ці сацыяльнай групе адметных якасцей – духоўных і матэрыяльных, інтэлектуальных і эмацыянальных, і, апроч мастацтва і літаратуры, яна ахоплівае вобраз жыцця, “уменне жыць разам”, сістэмы каштоўнасцей, традыцыі, вераванні»[3].

Паколькі НКС – гэта жывая спадчына, якая пастаянна развіваецца і аднаўляецца яе носьбітамі і пры ўмове захавання асноўнага кантэксту не падлягае кансервацыі і замарозцы, то канцэпцыя ўстойлівага развіцця як мага лепш падыходзіць для разумення працэсу яе аховы, пад якім мяркуецца найперш падтрыманне жыццядзейнасці гэтай спадчыны і яе перадачы, а таксама распаўсюджванне ведаў пра яе ў грамадстве.

У дадзеным артыкуле разглядаецца, як канвенцыянальныя меры па ахове НКС імплементуюцца ў розных практыках на лакальным і нацыянальным узроўнях (на прыкладах Беларусі і іншых краін).

## Канвенцыянальныя аспекты аховы НКС

Мэты Канвенцыі 2003 г. – гэта ахова НКС як сістэмы разнастайных мер (адміністратыўных, арганізацыйных, практычных і фінансавых), накіраваных на забеспячэнне жыццядзейнасці НКС і яе ўстойлівага развіцця; выхаванне павагі да нематэрыяльнай спадчыны адпаведных супольнасцей, груп, асобных людзей; прыцягненне ўвагі на мясцовым, нацыянальным і міжнародным узроўнях да НКС і яе ўзаемнае прызнанне; міжнароднае супрацоўніцтва і дапамога[4].

У арт. 11–13 Канвенцыі 2003 г. прадугледжваецца, што дзяржавы-ўдзельніцы абавязаны прымаць неабходныя меры для забеспячэння захавання НКС, якая знаходзіцца на іх тэрыторыі, і прыцягваць супольнасці, групы і адпаведныя няўрадавыя арганізацыі да ідэнтыфікацыі і вызначэння элементаў НКС. Яны павінны імкнуцца забяспечыць як мага больш шырокі ўдзел супольнасцей і асобных носьбітаў у ахове НКС і кіраванні ёю[5].

Асноўная канцэпцыя аховы НКС, як было пазначана вышэй, з’яўляецца своеасаблівай контрверсіяй парадыгмы аховы матэрыяльнай спадчыны. Гэта развіццё і жыццядзейнасць замест кансервацыі і рэстаўрацыі. Розніца таксама ў ацэнцы бенефіцыяраў. Для НКС гэта супольнасці, групы і асобныя носьбіты, а для матэрыяльнай спадчыны гэта найперш дзяржава і экспертная супольнасць.

Што датычыцца канкрэтных дзеянняў па ахове, Канвенцыя 2003 г. абмяжоўваецца агульнымі прапановамі, на падставе якіх дзяржавы-ўдзельніцы могуць распрацаваць самастойную палітыку, адаптаваную да іх сацыяльнага, палітычнага і культурнага кантэксту [1]. Сярод такіх прапаноў можна назваць вызначэнне ці стварэнне аднаго або некалькіх кампетэнтных органаў па ахове НКС; садзейнічанне навуковым, тэхнічным, мастацтвазнаўчым і іншым даследаванням, а таксама распрацоўцы навукова-даследчых метадалогій з мэтай эфектыўнай аховы НКС, асабліва той, якая знаходзіцца ў небяспецы; прыняцце адпаведных юрыдычных, тэхнічных, адміністрацыйных, фінансавых мер, накіраваных на стварэнне ці ўмацаванне ўстаноў, якія займаюцца падрыхтоўкай кадраў у галіне аховы НКС, і тых, што садзейнічаюць пераемнасці гэтай спадчыны, на забеспячэнне доступу да НКС пры выкананні практыкі, прынятай адпаведнымі супольнасцямі, і на стварэнне ўстаноў, якія займаюцца дакументаваннем і папулярызацыяй НКС[6] (арт. 13 Канвенцыі 2003 г.).

Акрамя таго, у Канвенцыі 2003 г. ад дзяржаў-удзельніц патрабуецца звярнуць асаблівую ўвагу на правядзенне мерапрыемстваў па ідэнтыфікацыі і інвентарызацыі НКС, а таксама на павышэнне грамадскай актыўнасці праз распаўсюджванне ведаў пра НКС.

Стварэнне інвентароў НКС дэкларавана арт. 12, 16 і 17 Канвенцыі 2003 г. У арт. 12 разглядаецца інвентарызацыя на нацыянальным узроўні, а ў арт. 16–17 – стварэнне міжнародных ахоўных спісаў у межах Канвенцыі 2003 г.[7] (спіс НКС, якой патрабуецца тэрміновая ахова, і рэпрэзентатыўны спіс НКС чалавецтва). Апошні створаны галоўным чынам для візуалізацыі і прасоўвання НКС, усведамлення яе значэння і важнасці для грамадства. На дадзеным этапе змяшчаюцца 529 элементаў са 135 краін свету[8]. Спіс НКС, што мае патрэбу ў тэрміновай ахове, складаецца з элементаў нематэрыяльнай спадчыны, якія знаходзяцца пад пагрозай і для якіх неабходна прыняць неадкладныя меры па захаванню. Уключэнне ў гэты спіс садзейнічае мабілізацыі міжнароднага супрацоўніцтва і дапамозе зацікаўленым бакам у прыняцці адпаведных ахоўных мер. Зараз у гэтым спісе 71 элемент з 38 краін[9].

[3]Всеобщая декларация ЮНЕСКО о культурном разнообразии // ООН [Электронный ресурс]. URL: https://www.un.org/ru/documents/decl_conv/declarations/cultural_diversity.shtml (дата обращения: 20.04.2022).
[4]Основные тексты Международной конвенции... С. 5.
[5]Там же. С. 9–10.
[6]Там же. С. 10–11.
[7]Там же. С. 10, 12.
[8]Representative list of the intangible cultural heritage of humanity // UNESCO [Electronic resource]. URL: https://ich.unesco.org/en/00011?type=00002#tabs (date of access: 10.02.2022).
[9]List of intangible cultural heritage in need of urgent safeguarding // UNESCO [Electronic resource]. URL: https://ich.unesco.org/en/00011?type=00003#tabs (date of access: 10.02.2022).

На нацыянальным узроўні можа быць некалькі інвентарных спісаў – агульны спіс, нацыянальны спіс, лакальныя спісы НКС асобных супольнасцей, тэматычныя спісы (напрыклад, асобны інвентар танцавальнай ці песеннай спадчыны) і інш.

Ідэнтыфікацыя і інвентарызацыя НКС – ключавыя аспекты ў яе захаванні ў адпаведнасці з Канвенцыяй 2003 г., таму што яны дазваляюць лепей задакументаваць і вывучыць гэтую спадчыну, выявіць яе асноўны кантэнт і вызначыць архетыпы, каб пасля скласці найбольш эфектыўны план яе аховы. Трэба адзначыць, што гэта адзіная канкрэтная мера, прадпісаная дзяржавамі-ўдзельніцамі. Аднак гэтыя працэсы ніколі не заканчваюцца, паколькі НКС з’яўляецца жывой і зменлівай рэальнасцю, яе спісы ніколі не могуць лічыцца вычарпальнымі і павінны рэгулярна абнаўляцца[10] (арт. 12.1 Канвенцыі 2003 г.).

Як адзначаюць некаторыя даследчыкі, працэс інвентарызацыі ў многіх краінах (асабліва гэта характэрна для еўрапейскай традыцыі) адбываецца такім жа чынам, як і ў дачыненні да матэрыяльнай спадчыны, калі да праяў НКС ставяцца як да аб’ектаў або гатовых прадуктаў ці ўласнасці[11]. Ідэнтыфікацыя элементаў НКС часцей за ўсё прадстаўлена ў выглядзе запісаў у тэкставым або аўдыёвізуальным фармаце і архіваў для захоўвання атрыманых дакументаў і файлаў. Такі пункт гледжання азначае асэнсаванне нематэрыяльнай спадчыны як уласнасці, рэчаў, якія можна дакладна і аб’ектыўна ідэнтыфікаваць, размежаваць, акрэсліць і класіфікаваць. Гэта значыць, што спадчына як прадукт аддзяляецца ад сацыяльных працэсаў стварэння, выкарыстання і ацэнкі [2]. Тым не менш ЮНЕСКА адмовілася ад канцэпцыі ўласнасці ў дачыненні да НКС [2], і гэта адлюстравана ў аперацыйным кіраўніцтве Канвенцыі 2003 г. [4]. На практыцы такі падыход азначае актыўны ўдзел супольнасцей, груп і асобных носьбітаў, экспертаў і іншых стэйкхолдараў ва ўсіх працэсах імплементацыі Канвенцыі 2003 г., у тым ліку ідэнтыфікацыі і інвентарызацыі НКС, а таксама ў яе ацэнцы, маніторынгу і захаванні. Звыш таго, інвентарныя запісы павінны ўтрымліваць, акрамя стандартных апісанняў, характарыстыку сацыяльнага і прыроднага кантэксту (сацыяльныя функцыі, умовы існавання, культурны ландшафт, апісанне датычных супольнасцей і асобных носьбітаў, рызыкі і пагрозы), а таксама меры па захаванні элементаў НКС і даныя штогадовага маніторынгу.

Адным з цэнтральных фактараў захавання НКС з’яўляецца павышэнне дасведчанасці грамадства аб значэнні НКС. Гэтаму працэсу прысвечаны раздз. IV у аперацыйным кіраўніцтве Канвенцыі 2003 г.[12] Візуалізацыя НКС на ўсіх ўзроўнях грамадскай актыўнасці спрыяе лепшаму яе разуменню ў працэсе самаідэнтыфікацыі, асэнсаванню значэння гэтай спадчыны для будучых пакаленняў і яе ролі ў кантэксце сацыяльна-культурнага развіцця. Існуюць некалькі найбольш вядомых форм рэалізацыі гэтай дзейнасці: праз сістэму адукацыі, з дапамогай сродкаў масавай інфармацыі і шляхам прамога ўдзелу. Тут варта ўспомніць вядомую формулу англійскага даследчыка С. Тэрлі (цыкл спадчыны), якую ён прапанаваў у якасці канцэпцыі аховы спадчыны як найбольш эфектыўны інструмент для яе пазнання, апекавання і захавання – ад пазнання і ўсведамлення значэння спадчыны да яе ацэнкі, ад ацэнкі да ўшанавання, ад ушанавання да непасрэднага ўдзелу ў яе захаванні [5].

Высока ацэньваючы ролю папулярызацыі НКС і павышэння інфармаванасці грамадства аб яе значэнні, ЮНЕСКА тым не менш звяртае ўвагу на рызыкі і пагрозы для НКС, якія непазбежна суправаджаюць вышэйзгаданую дзейнасць. Сярод іх – рызыкі сацыяльнай, этнічнай, рэлігійнай, моўнай і іншай дыскрымінацыі; незаконнае прысваенне і несумленнае выкарыстанне ведаў і навыкаў адпаведных супольнасцей і груп, асобных носьбітаў НКС; праяўленне празмернай камерцыялізацыі ці няўстойлівага турызму ў адносінах да НКС; дэкантэкстуалізацыя і фальклярызацыя асобных элементаў НКС. З улікам з’яўлення магчымых пагроз ЮНЕСКА склала рэкамендацыі, а часам і патрабаванні, якіх неабходна прытрымлівацца пры ажыццяўленні розных мерапрыемстваў па павышэнню дасведчанасці. Па-першае, усе актыўнасці павінны адбывацца пры шырокім удзеле носьбітаў і практыкаў НКС, а таксама праз іх свабодную, папярэднюю, інфармаваную згоду[13] (п. 101 (b) аперацыйнага кіраўніцтва Канвенцыі 2003 г.); па-другое, дзейнасць па павышэнню інфармаванасці неабходна ажыццяўляць пры поўнай павазе да практыкі НКС, якая рэгламентуе доступ да элементаў НКС[14] (п. 101 (c) аперацыйнага кіраўніцтва Канвенцыі 2003 г.); па-трэцяе, усе ўдзельнікі і арганізатары гэтай дзейнасці мусяць быць вельмі асцярожнымі, каб мінімізаваць ці прадухіліць магчымыя рызыкі, у тым ліку шляхам стварэння спецыяльных этычных кодэксаў у дачыненні да НКС[15] (п. 102 (b) аперацыйнага кіраўніцтва Канвенцыі 2003 г.).

[10] Основные тексты Международной конвенции... С. 10.

[11] Паняцце ўласнасці ў дачыненні да спадчыны засноўваецца на падыходзе, адлюстраваным у Канвенцыі аб сусветнай культурнай і парыроднай спадчыне 1972 г., у якой у асноўным разглядаецца матэрыяльная спадчына, а таксама там, дзе такі падыход цалкам апраўданы.

[12] Основные тексты Международной конвенции... С. 25–97.

[13] Там же. С. 58.

[14] Там же.

[15] Там же. С. 59.

НКС з пункту гледжання Канвенцыі 2003 г. аналізуецца як «рухаючая сіла і гарант устойлівага развіцця»[16]. ЮНЕСКА адзначае неабходнасць поўнай інтэграцыі НКС у планы, палітыку і праграмы ўстойлівага развіцця на ўсіх узроўнях[17] (п. 170 аперацыйнага кіраўніцтва Канвенцыі 2003 г.). Абавязак дзяржаў-удзельніц – максімальна спрыяць уключэнню супольнасцей, груп і асобных носьбітаў НКС у распрацоўку вышэйзгаданых планаў і праграм, паколькі менавіта апошнія з'яўляюцца іх асноўнымі бенефіцыярамі.

Варта адзначыць, што паняцце супольнасці згодна з Канвенцыяй 2003 г. мае адкрыты характар. Яна не абавязкова звязана з канкрэтным месцам, можа быць размеркавана на вялікай тэрыторыі або звязана з пэўнымі локусамі. Асноўным крытэрыем вызначэння супольнасці з'яўляецца маркёр ідэнтычнасці ў дачыненні да пэўных элементаў НКС. Унутры супольнасці таксама няма аднастайнасці. Яна складаецца з актыўных носьбітаў і практыкаў і пасіўных удзельнікаў. Апошнія тым не менш маюць даволі выразную самаідэнтыфікацыю адносна НКС.

Сёння мэтанакіраваная рэалізацыя планаў устойлівага развіцця – самая дзейсная мера па захаванні НКС і яе міжпакаленнай перадачы. Практычна ўсе вядомыя элементы НКС карэлююць з мэтамі ўстойлівага развіцця, як яны былі сфармуляваны Генеральнай Асамблеяй ААН у 2015 г.[18] Напрыклад, роля НКС можа быць даволі значнай для харчовай бяспекі (мэты 1 і 2), калі гаворка ідзе пра традыцыйныя веды і практыкі ў галіне земляробства, рыбалоўства, палявання, кулінарных традыцый, бортніцтва і інш. Развіццё народнай медыцыны спрыяе развіццю аховы здароўя і дабрабыту (мэта 3), а інтэграцыя ведаў пра НКС у школьныя праграмы і праграмы ўстаноў вышэйшай адукацыі будзе садзейнічаць якаснай адукацыі і павазе да ўласнай культуры і гісторыі (мэта 4). Многія нематэрыяльныя практыкі ўмацоўваюць эканамічную стабільнасць датычных да іх супольнасцей, спрыяюць развіццю інклюзіўнай эканомікі і крэатыўнага сектара (мэты 8, 9, 11). Узаемадзеянне, а ў некаторых выпадках і злучанасць НКС з акаляючым асяроддзем, культурным і прыродным ландшафтам садзейнічаюць захаванню экалагічнага балансу, падтрымцы і развіццю біяразнастайнасці (мэты 12–15).

## Практычныя меры па ахове НКС

Як ужо было адзначана вышэй, кожная дзяржава – удзельніца Канвенцыі 2003 г. выпрацоўвае ўласную палітыку па ахове НКС, абапіраючыся на спецыфіку свайго заканадаўства, сацыяльна-эканамічныя і палітычныя абставіны. У Канвенцыі 2003 г. не даюцца дакладныя інструкцыі, як лепей захоўваць НКС, але прапаноўваецца даволі эфектыўны механізм, адлюстраваны ў так званым рэестры належнай практыкі аховы НКС. Ён быў распрацаваны ЮНЕСКА ў 2009 г. паводле арт. 18 Канвенцыі 2003 г., які прапануе дзяржавам-удзельніцам кожны год падаваць у ЮНЕСКА розныя праграмы, праекты і мерапрыемствы па ахове НКС. Міжурадавы камітэт ЮНЕСКА па ахове нематэрыяльнай культурнай спадчыны (далей – Камітэт) разглядае прапановы і суправаджае іх ажыццяўленне праз распаўсюджванне і папулярызацыю.

Рэестр належнай практыкі аховы НКС дазваляе краінам, супольнасцям і іншым стэйкхолдарам даведацца пра найбольш паспяховыя намаганні і прыклады таго, як можна пераадолець розныя выклікі гэтага захавання і забяспечыць перадачу нематэрыяльнай спадчыны (традыцыйных практык і ведаў, культурных экспрэсій) наступным пакаленням. Гэтыя метады і мадэлі могуць стаць карыснымі і адаптавацца да розных умоў з улікам нацыянальнага і лакальнага кантэкстаў.

Сёння рэестр належнай практыкі аховы НКС утрымлівае 29 элементаў НКС з 26 краін[19]. Частка іх датычыцца агульнай палітыкі ці стратэгіі па ахове НКС і мае больш шырокі дыяпазон уплыву, астатнія адносяцца да больш вузкага кола дзейнасці, напрыклад звязаныя з інтэграцыяй НКС у сістэму фармальнай і нефармальнай адукацыі (Школа жывых традыцый у Паўночным Ілакосу (Філіпіны) ці этнашкола-музей у мястэчку Пусоль (Іспанія)) або накіраваныя на забеспячэнне пераемнасці НКС у сучасным культурным кантэксце ва ўмовах глабальнай трансфармацыі і знікнення традыцыйнага асяроддзя (праграма «Зямля легендаў» для прасоўвання і актывізацыі мастацтва пераказу ў рэгіёне Кронуберг (Швецыя), праграма захавання традыцыйных гульняў ва Фландрыі (Бельгія)). Перадачы НКС садзейнічаюць таксама шматлікія фестывалі народнай творчасці, практыкі падтрымкі рамесніцкай дзейнасці і інш. Вялікую ролю ў імплементацыі Канвенцыі 2003 г. і захаванні НКС могуць выконваць мясцовыя цэнтры культуры (цэнтры і дамы рамёстваў і інш.), якія кансалідуюць вакол сябе найбольш актыўных прадстаўнікоў мясцовых супольнасцей і з'яўляюцца своеасаблівымі асяродкамі грамадскага ўплыву. Яны праводзяць актыўную адукацыйную працу з дзецьмі і моладдзю, тым самым спрыяючы перадачы НКС («Чыталішчы» (культурныя цэнтры ў Балгарыі)).

[16]Основные тексты Международной конвенции... С. 80.

[17]Там же.

[18]Цели в области устойчивого развития [Электронный ресурс]. URL: https://www.un.org/sustainabledevelopment/ru/sustainable-development-goals/ (дата обращения: 10.02.2022).

[19]Register of good safeguarding practices // UNESCO [Electronic resource]. URL: https://ich.unesco.org/en/00011?text=&type[]=00005&multinational=3&display1=inscriptionID#tabs (date of access: 10.02.2022).

Беларускі вопыт імплементацыі Канвенцыі 2003 г. бярэ пачатак з 2006 г., калі Рэспубліка Беларусь, як адна з першых краін, ратыфікаваўшых яе, увайшла ў склад Камітэта. У 2009 г. на пасяджэнні Камітэта ў Найробі (Кенія) першы беларускі элемент НКС – «Калядныя цары в. Семежава Капыльскага раёна Мінскай вобласці» – быў уключаны ў спіс НКС, якой патрабуецца тэрміновая ахова. У гэтым жа годзе была атрымана фінансавая дапамога ад ЮНЕСКА на стварэнне нацыянальнага інвентару НКС. Пачаўся складаны працэс па выпрацоўцы і рэалізацыі адпаведнай нацыянальнай палітыкі, якая ўключала ў сябе гарманізацыю заканадаўства з улікам палажэнняў Канвенцыі 2003 г., распрацоўку канцэпцыі і метадалогіі інвентарызацыі НКС, фарміраванне нацыянальнага інвентару і ўсталяванне сеткі стэйкхолдараў (актывістаў і практыкаў НКС, экспертаў, прадстаўнікоў дзяржаўных і недзяржаўных арганізацый), падрыхтоўка прафесіяналаў у галіне НКС, павышэнне патэнцыялу прадстаўнікоў супольнасцей НКС, нарэшце, стварэнне сістэмы кіравання спадчынай, якая ў адпаведнасці з Канвенцыяй 2003 г. будуецца знізу ўверх – ад асноўных актараў на месцах распаўсюджвання НКС (у канкрэтных лакацыях ці групах праз рэгіянальныя цэнтры народнай творчасці, якія ў гэтай сістэме выконваюць ролю каардынуючых цэнтраў) да экспертных цэнтраў і Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь. Апошняе прымае рашэнне аб уключэнні элементаў НКС у Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь (далей – Дзяржаўны спіс).

З улікам спецыфікі заканадаўства ў Беларусі сёння існуюць два ахоўныя спісы для НКС. Першы і асноўны, які надае дзяржаўны статус аховы для элементаў НКС як гісторыка-культурнай каштоўнасці, – гэта ўзгаданы Дзяржаўны спіс (з’яўляецца агульным для матэрыяльных і нематэрыяльных культурных каштоўнасцей). Другі – нацыянальны інвентар НКС, які выконвае ролю рэгістратара для ўсіх элементаў НКС, прыведзеных для разгляду прадстаўнікамі супольнасцей і рэгіянальнымі цэнтрамі народнай творчасці.

Нацыянальны інвентар НКС Беларусі «Жывая спадчына» пачаў дзейнічаць з 2014 г. Асноўная яго мэта – забеспячэнне аховы НКС і ўключэнне яе ў сферу рэгіянальнай і лакальнай палітыкі. Інвентар ахоплівае нематэрыяльныя каштоўнасці розных рэгёнаў і мясцін Беларусі, выяўленыя і ідэнтыфікаваныя пры непасрэдным удзеле носьбітаў – супольнасцей, груп, асобных людзей, а таксама экспертаў і прадстаўнікоў грамадскіх арганізацый. Як падкрэслена ў практычным кіраўніцтве па інвентарызацыі НКС, інвентар НКС Беларусі абапіраецца на неабходнасць захавання раўнавагі паміж сацыяльна-эканамічным развіццём рэгёнаў, аховай культурнага ландшафту, дасягненнямі народнай культуры. Захаванне НКС з’яўляецца пазітыўным імпульсам для развіцця тэрыторый, іх самаідэнтыфікацыі і культурнай самарэалізацыі [6, с. 30]. Структура інвентару не мяркуе ніякай іерархіі ўнутры сябе – у ім няма падзелу на катэгорыі згодна з крытэрыям вартасці (нацыянальны, рэгіянальны ці лакальны), як гэта прынята ў дачыненні да матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей. Асноўная прычына ўключэння – ідэнтыфікацыя з боку носьбітаў (супольнасцей, груп, асобных практыкаў). У сучасны момант у інвентар уключаны каля 130 элементаў НКС, і працэс гэты працягвае развівацца. З тэхнічнага пункту гледжання гэта інавацыйны рэсурс, база даных, створаная для захоўвання вялікіх масіваў каштоўнай інфармацыі, якая падтрымліваецца адпаведным інтэрнэт-парталам[20].

Згодна з Канвенцыяй 2003 г. для супольнасцей інвентарызацыя стварае пачуццё самабытнасці і далучанасці да спадчыны, эмацыянальную сувязь, матывацыю да перадачы наступным пакаленням, а для экспертаў, дзяржаўных органаў улады і арганізацый – магчымасць эфектыўнага кіравання і вывучэння, выпрацоўкі стратэгіі і тактыкі аховы. Існуюць пэўныя выклікі, звязаныя з метадалогіяй працэсу інвентарызацыі, і палітычныя выклікі, якія адносяцца ў асноўным да спосабаў кіравання. Практыкі НКС, якія падлягаюць інвентарызацыі, належаць адной супольнасці ці групе (напрыклад, аб’яднанню рамеснікаў), таму і працэс інвентарызацыі павінен праводзіцца імі. У беларускім прыкладзе інвентарызацыя пачынаецца менавіта з тых, хто захоўвае гэтыя элементы і пастаянна іх аднаўляе, – у гэтую справу ўцягнуты менавіта носьбіты традыцый (прадстаўнікі розных сацыяльных груп і сегментаў, якія з’яўляюцца часткай датычнай супольнасці). Тут сам працэс мае большае значэнне, чым вынік, бо ў супрацоўніцтве і камунікацыі адбываецца фарміраванне ідэнтытэту і адказнасці ў адносінах да спадчыны. На наступных этапах праводзіцца тэхнічная і навуковая экспертыза элементаў НКС (ў адпаведнасці з Канвенцыяй 2003 г.), якую забяспечваюць рэгіянальныя каардынацыйныя цэнтры разам са службай нацыянальнага інвентару, адбываецца падрыхтоўка намінацыі ў Дзяржаўны спіс і па завяршэнні элемент НКС набывае статус гісторыка-культурнай каштоўнасці. Тым не менш інвентар НКС – гэта не проста спіс элементаў з кароткім апісаннем. Ён утрымлівае ключавыя аспекты для вывучэння і разумення элементаў культуры – сацыяльна-эканамічны, культурны і прасторавы кантэксты, дзе жывуць носьбіты спадчыны. Інвентар НКС уключае апісанні і характарыстыкі людзей, што выраблююць, выкарыстоўваюць,

[20]Жывая спадчына Беларусі. Інвентар нематэрыяльнай культурнай спадчыны [Электронны рэсурс]. URL: http://living-heritage.by/ (дата звароту: 14.02.2022).

трансфармуюць, перадаюць элементы НКС і прызнаюць іх сваёй спадчынай. Аднак, як паказвае практыка, на наступных этапах сувязь носьбітаў з інвентаром досыць умоўная, яны не могуць наўпрост уплываць на працэсы, якія адбываюцца з гэтай інфармацыяй, акрамя, магчыма, рэгуляцыі доступу да яе, калі інвентар першапачаткова абазначаны па просьбе носьбітаў. Каб забяспечыць пастаянны дыялог паміж экспертамі і носьбітамі НКС, у Фінляндыі, напрыклад, прапануюць выкарыстоўваць форму вікіінвентара, які зроблены на платформе «Вікіпедыя» і з'яўляецца адкрытым рэсурсам. Ён даступны для ўсіх, а найперш для практыкаў НКС, якія могуць самастойна падаваць звесткі пра сваю спадчыну, запоўніўшы нескладаную анкету, карэкціраваць іх па патрэбе, а таксама камунікаваць паміж сабой. Вікіінвентар з'яўляецца прамежкавай ступенню на шляху да Нацыянальнага інвентару НКС Фінляндыі, які вядзе Міністэрства культуры і спорту Фінляндыі з дапамогай адпаведных экспертаў[21]. Апошні акумулюе інфармацыю з вікіінвентару праз адпаведную экспертызу і фарміруе ўжо выверанны кантэнт. Ён выкарыстоўваецца ў асноўным для мэт кіравання спадчынай, навуковых даследаванняў, а таксама як рэгістратар даных.

Такім чынам, інвентарызацыя і дакументаванне – важныя этапы ў захаванні НКС, абумоўленыя арт. 12–15 Канвенцыі 2003 г. Але не менш значнай з'яўляецца яго сацыяльная адаптацыя і выкарыстанне. Напрыклад, інвентар НКС Беларусі даволі паспяхова выконвае ролю адукацыйнага і навуковага рэсурсу, аднак як сацыяльная і дыялогавая платформа для ўсіх зацікаўленых у працэсе аховы НКС ён патрабуе ўдасканалення і, магчыма, рэвалярызацыі.

На практычным узроўні працэс імплементацыі Канвенцыі 2003 г. закранае розныя сферы, у тым ліку забеспячэнне жыццядзейнасці элементаў НКС і іх перадачу, а таксама прадухіленне магчымых рызык і пагроз. Сярод апошніх вызначаюцца выклікі глабальнага парадку (урбанізацыя традыцыйных лакацый, міграцыя моладзі, змена грамадскіх прыярытэтаў і інш.) або суб'ектыўныя фактары, абумоўленыя некарэктнай палітыкай аховы, такія як фальклярызацыя элементаў НКС (навязванне сцэнічных форм фальклору, адарванасць ад рэальнага кантэксту, спроба палепшыць, падправіць існуючыя формы НКС), няўстойлівы турызм, які парушае правы носьбітаў НКС, этычныя нормы і ўсталяваныя межы доступу, эксплуатацыя носьбітаў без іх згоды, звышкамерцыялізацыя традыцыйных ведаў і практык і несправядлівае размеркаванне даходаў і інш. Усё гэта можа прывесці да страты элементаў НКС ці змянення іх каштоўнасных характарыстык.

У Рэспубліцы Беларусь прамыя заканадаўчыя нормы, якія б абаранялі інтэлектуальныя правы носьбітаў НКС, у тым ліку датычных да іх супольнасцей і груп, пакуль не распрацаваны. Тым не менш нават у рамках існуючага заканадаўства такія магчымасці існуюць. Закон Рэспублікі Беларусь ад 17 ліпеня 2002 г. №127-З «Аб геаграфічных указаннях»[22] мог бы стаць эфектыўным інструментам для рэгістрацыі калектыўнага права супольнасцей ці груп, веды і практыкі якіх звязаны з канкрэтнай геаграфічнай назвай (напрыклад, «Бортны мёд Лельчыцкага раёна» ці «Маладзечанская школа выцінанкі» і інш.). Прававая ахова геаграфічнага ўказання (згодна з арт. 2.1 гэтага закона) ажыццяўляецца на падставе яго рэгістрацыі ў Нацыянальным цэнтры інтэлектуальнай уласнасці, а правы карыстання ім могуць быць дэлегіраваны любой фізічнай ці юрыдычнай асобе ці аб'яднанню асоб (арт. 2.2). Для рамеснікаў і аб'яднанняў рамеснікаў існуюць таксама магчымасці запатэнтаваць свае прадукты ці вытворныя ад іх у рамках Закона Рэспублікі Беларусь ад 17 мая 2011 г. № 262-З «Аб аўтарскім праве і сумежных правах»[23]. Найлепшым варыянтам для НКС, аднак, была б спецыяльная сертыфікацыя носьбітаў НКС і вынікаў іх творчасці праз рэгістрацыю ў адпаведнай базе даных, як, напрыклад, гэта зроблена ў Літве[24], дзе з 2007 г. дзейнічае закон аб прадуктах нацыянальнай спадчыны [3].

Захаванню НКС спрыяюць такія разнастайныя ініцыятывы па яе папулярызацыі і распаўсюджванню, як дакументальны серыял «Жывая культура» на беларускім тэлебачанні, што ў дасведчанай манеры распавядае пра элементы НКС, узятыя пад ахову. Аднак большым эфектам валодаюць розныя партысіпацыйныя праекты накшталт рэспубліканскага фестывалю «Берагіня», фальклорна-этнаграфічнага летніка «Пятровіца» у Любанскім раёне Мінскай вобласці ці конкурса народных танцаў «Мяцеліца», у якім удзельнічаюць разнастайныя клубы і аб'яднанні традыцыйнага танцавальнага мастацтва з усёй Беларусі.

---

[21]Wiki-inventory for living heritage [Electronic resource]. URL: https://wiki.aineetonkulttuuriperinto.fi/ (date of access: 10.02.2022).

[22]Закон Республики Беларусь от 17 июля 2002 года №127-З «О географических указаниях» // База данных. Законодательство стран СНГ [Электронный ресурс]. URL: https://base.spinform.ru/show_doc.fwx?rgn=8086 (дата обращения: 10.02.2022).

[23]Закон Республики Беларусь от 17 мая 2011 г. № 262-З «Об авторском праве и смежных правах» // Kodeksy-by [Электронный ресурс]. URL: https://kodeksy-by.com/zakon_rb_ob_avtorskom_prave_i_smezhnyh_pravah.htm (дата обращения: 10.02.2022).

[24]Tautinis paveldas [Elektroninis šaltinis]. URL: https://www.tautinispaveldas.lt (prisijungimo data: 10.02.2022).

## Заключэнне

Нематэрыяльная спадчына па сваёй прыродзе не з'яўляецца статычнай з'явай, а азначае працэс і развіццё, пастаяннае аднаўленне і перадачу ад пакалення да пакалення. У гэтым сэнсе яна надзвычай уразлівая ў парадыгме часу і прасторы. Жыццядзейнасць НКС, як аснова для захавання, залежыць ад яе носьбітаў і практыкаў, ад іх матывацыі і каштоўнасных прыярытэтаў, ад жадання падтрымліваць пераемнасць і перадаваць у спадчыну.

Рэспубліка Беларусь як дзяржава – удзельніца Канвенцыі 2003 г. робіць канкрэтныя крокі па яе імплементацыі, распаўсюджванню ведаў пра НКС. Ідэнтыфікацыя і інвентарызацыя НКС, фарміраванне адпаведнай палітыкі аховы, умацаванне інстытуцыянальных рамак і нарошчванне актыўнага грамадскага патэнцыялу, а таксама развіццё міжнародных адносін прывялі да пэўных станоўчых вынікаў, абазначылі выразную тэндэнцыю падтрымкі як з боку носьбітаў і практыкаў НКС, так і ў больш шырокай перспектыве.

Сёння Беларусь у ахоўных спісах ЮНЕСКА прадстаўлена чатырма элементамі НКС, яшчэ два знаходзяцца ў працэсе разгляду Камітэтам. Працягвае развівацца нацыянальная база даных НКС, якая фарміруецца на падставе лакальных і рэгіянальных ініцыятыў.

Аднак сам працэс захавання ва ўмовах сучасных трансфармацый і ўрбанізацыі штодзённага жыцця не можа абапірацца толькі на волю і ініцыятыву датычных да НКС супольнасцей, груп ці асобных людзей. Каб быць эфектыўным, ён патрабуе падтрымкі з боку дзяржавы, розных інстытуцый, няўрадавых арганізацый – больш шырокага грамадскага ўдзелу, супрацоўніцтва і ўзаемадзеяння паміж усімі зацікаўленымі (ад мясцовых суполак і груп уплыву да цэнтраў рамёстваў, дамоў культуры, урада і муніцыпалітэтаў). Варта больш шырока падтрымліваць дзейнасць і развіццё грамадскіх ініцыятыў па ахове НКС знізу ўверх, з улікам інтарэсаў саміх носьбітаў і практыкаў традыцыйнай культуры, забяспечваючы таксама падтрымку новых крэатыўных праектаў на аснове НКС.

## Бібліяграфічныя спасылкі

1. Blake J. *Developing a new standard-setting instrument for the safeguarding of intangible cultural heritage: elements for consideration*. Paris: UNESCO; 2001. 102 p.

2. Bonell FE, Cartañà MC. Inventaris de PCI. L'aplicació de la Convenció de la UNESCO. *Revista d'etnologia de Catalunya*. 2014;39:41–56.

3. Pareigienė L, Ribašauskienė E. Protection of traditional handicrafts: the Lithuanian case. *Research for Rural Development.* 2018;2:238–244.

4. Smeets R. *La notion d'«élément» dans la rédaction de la Convention 2003 et de ses Directives opérationnelles*. París: UNESCO; 2012. 56 p.

5. Thurley S. Into the future. *English Heritage – the First 21 Years*. 2005;49:26–27.

6. Сташкевіч АБ, Боганева АМ, Валодзіна ТІ, Варфаламеева ТБ, Кухаронак ТІ, Лабачэўская ВА і інш. *Ідэнтыфікацыя і інвентарызацыя нематэрыяльнай культурнай спадчыны Беларусі. Практычнае кіраўніцтва*. Мінск: Інстытут культуры Беларусі; 2013. 164 с.

## References

1. Blake J. *Developing a new standard-setting instrument for the safeguarding of intangible cultural heritage: elements for consideration*. Paris: UNESCO; 2001. 102 p.

2. Bonell FE, Cartañà MC. Inventaris de PCI. L'aplicació de la Convenció de la UNESCO. *Revista d'etnologia de Catalunya*. 2014;39:41–56.

3. Pareigienė L, Ribašauskienė E. Protection of traditional handicrafts: the Lithuanian case. *Research for Rural Development.* 2018;2:238–244.

4. Smeets R. *La notion d'«élément» dans la rédaction de la Convention 2003 et de ses Directives opérationnelles*. París: UNESCO; 2012. 56 p.

5. Thurley S. Into the future. *English Heritage – the First 21 Years*. 2005;49:26–27.

6. Stashkevich AB, Boganeva AM, Valodzina TI, Varfalameeva TB, Kuharonak TI, Labachjewskaja VA, et al. *Idjentyfikacyja i inventaryzacyja nematjeryjal'naj kul'turnaj spadchyny Belarusi. Praktychnae kirawnictva* [Identification and inventorying of intangible cultural heritage of Belarus. Practical guide]. Minsk: Instytut kul'tury Belarusi; 2013. 164 p. Belarusian.

*Артыкул паступіў у рэдкалегію 09.07.2022.*
*Received by editorial board 09.07.2022.*